ДУК «Бібліятэчная сетка Хоцімскага раёна»
Батаеўская бібліятэка-музей

# Сапраўдны гонар Беларусі

## Віртуальная выстава

Слуцкія паясы – выдатная з’ява культурнай спадчыны Беларусі

- “Слуцкія паясы лішні раз нагадваюць простую ісціну, на якой трымаецца наша зямля: шчаслівае тое грамадства, дзе арганічна сплятаюцца духоўныя каштоўнасці і матэрыяльныя сілы, традыцыі і навацыі, мінулае і будучае”.

- З Паслання Прэзыдэнта РБ А.Р.Лукашэнкі беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу РБ.




# Слуцкія паясы: Мастацтва, асобы, эпоха

У сусветнай культуры слуцкія паясы маюць значэнне нацыянальнага сімвала Беларусі. Яны ацэньваюцца як буйнейшы здабытак айчыннага і еўрапейскага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Гэта акалічнасць стала асновай для прыняцця Дзяржаўнай праграмы адраджэння традыцый і тэхналогій вырабу слуцкіх паясоў і развіцця нацыянальнай сувенірнай прадукцыі, зацверджанай Саветам Міністраў Рэспублікі Беларусь у 2012 годзе. Кніга выйшла ў свет у 2015 годзе ў выдавецтве «Беларусь»






## Вяртанне: памятаць, бачыць і ведаць

Неабходнасць вырашэнне праблемы вяртання нацыянальнай спадчыны з выкарыстаннем сучасных сродкаў і метадаў стала відавочнай. Яшчэ ў 1987 годзе пры Беларускім фондзе культуры была створана камісія “Вяртанне” па збіранні інфармацыі аб помніках беларускай культуры за межамі нашай краіны. Справа вяртання нацыянальнай спадчыны працягваецца і ўзбагачваецца новымі формамі, падтрымліваецца інфармацыйнымі тэхналогіямі. Годным вынікам дзейнасці беларускіх вучоных бачыцца фарміраванне ў свядомасці грамадства ведаў аб іншых унікальных здабытках нацыянальнай культуры і, як вынік, шанаванне высокіх духоўных вытокаў беларускага народа, гонар за нашу Айчыну, за яе багатую гісторыю.






## З гісторыі Слуцкай персіярні

Слуцкія паясы – выдатная з’ява культурнай спадчыны Беларусі – невыпадкова занялі пачэсны тытул нацыянальнага сімвала краіны. Мы па праву ганарымся тым, што менавіта нашы продкі стварылі адметны ўзор мастацкага ткацтва, які набыў сусветную вядомасць. Гісторыя ткацкай мануфактуры ў Слуцку непарыўна звязана з лёсам беларускіх зямель у складзе Рэчы Паспалітай і Расійскай імперыі, а дакладней са становішчам у тагачасным грамадстве радавой арыстакратыі і багатага мяшчанства, ладам іх жыцця, характарам пабытавай культуры.







## Слуцкія паясы.
## Культутурна-гістарычны кантэкст

Феномен слуцкіх паясоў мае важнае значэнне: ён сведчыць аб узроўні нацыянальнай мануфактурнай вытворчасці, якая ўзнялася да высокага мастацтва. Пацвярджэннем гэтага стала сусветная выстаўка 1878 года ў Парыжы, дзе слуцкія паясы выклікалі захапленне ў замежных знаўцаў і з таго часу сталі прадметам пошуку іназемцамі для сваіх збораў як творы мастацтва. Няўмольны час зрабіў слуцкі пояс рэдкасцю, і ў першаю чаргу на яго радзіме – у Беларусі. Калекцыя слуцкіх паясоў з Дзяржаўнай карціннай галерэі БССР была страчана падчас вайны. Слуцкія паясы з’яўляюцца адным з яркіх прыкладаў высокага ўзроўню развіцця нацыянальнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва.






## Мастацкія асаблівасці слуцкіх паясоў

Мастацкія асаблівасці слуцкіх паясоў становяцца зразумелымі пры іх параўнанні з аналагічнымі тканінамі ўсходняга паходжання з тымі кунтушовымі паясамі, якія выраблялiся на мануфактурах Рэчы Паспалітай. Слуцкія паясы вызначаюцца арыгінальнай перапрацоўкай усходніх першакрыніц, арганічным спалучэннем дэкаратыўных стыляў Усходу і Захаду. Вырабы слуцкай мануфактуры характырызуюцца багаццем арнаментальных матываў, іх тонкай прапрацоўкай, шматварыянтнасцю спалучэнняў у арнаментальныя структуры, гарманічнасцю каларыта.






## Шляхецкі касцюм і кунтушовыя паясы

Стварэнне Слуцкай персіярні не было выпадковасцю. Выраб шаўковых, літых і напаўлітых залатых і срэбраных паясоў абяцаў несумненны прыбытак, бо менавіта на 1760-я гады ў Рэчы Паспалітай прыпаў найбольшы росквіт нацыянальнай моды, адметнага нацыянальнага мужчынскага касцюма. Абавязковай часткай мужчынскага строю быў шаўковы пояс, які надаваў касцюму нацыянальную адметнасць і мастацкую завершанасць. Вялікі попыт на залатканыя паясы абумовіў арганізацыю іх мясцовай вытворчасці, каб замяніць імпарт, стварыць канкурэнцыю паясам, што прывозіліся з Турцыі, Ірана і Кітая.






## Радзівілы – primus inter pares

У кожным нацыянальным касцюме, у кожнай праяве моды розных часоў і розных саслоўяў прысутнічае свой адметны элемент. Але ні адзін з іх не стаў такім значным па сваім сэнсавым і гістарычным змесце, як знакаміты слуцкі пояс.

Час змяняе межы дзяржаў, зрыньваючы ў прах вялікія імперыі і сціраючы з гісторыі імёны іх кіраўнікоў. Аднак дзяржавы знікаюць, але застаюцца людзі з іх нязменнай самабытнасцю і векавымі традыцыямі. Дзякуючы Радзівілам лепшыя з гэтых традыцый знайшлі сваё ўвасабленне ў слуцкім паясе, унікальным і непаўторным.






## Слуцкія паясы ў музеях свету

Кантушовыя паясы на працягу значнага часу з’яўляліся неад’емнай часткай нацыянальнага строю магнатэрыі, шляхты і заможнага мяшчанства Рэчы Паспалітай. У сувязі з гэтым іх распаўсюджванне было вызначана як пэўнымі гістарычнымі прычынамі, так і абмежаваннем выкарыстання пераважна ў пабытовай сферы жыхароў Усходняй Еўропы. Гэтая акалічнасць абумовіла сучасную канцэнтрацыю кунтушовых паясоў у музейных сборах Польшчы, Літвы, Украіны, дзе захоўваюцца найбольш каштоўныя і шматлікія іх калекцыі. Зборы кунтушовых паясоў ёсць таксама ў іншых музеях свету.